паглыбляюць свае тэарэтычныя веды, звяртаюць увагу на ўзаемасувязь паміж гуманітарнымі і гуманітарнымі навукамі. Далей практычныя заняткі праводзяцца па падгрупах (не болей 10 чалавек). Кожная падгрупа складае макет алфавітнага каталога. Затым на выніковых групавых занятках (каля 40 студэнтаў у групе) кожная падгрупа абараняе методыку арганізацыі алфавітнага каталога.

Абагульненне вопыту арганізацыі і методыкі правядзення заняткаў па курсу «Бібліятэчныя каталогі» на бібліятэчным аддзяленні літаратурнага факультэта Дамаскага універсітэта сведчыць аб тым, што для ўдасканалення падрыхтоўкі кадраў мэтазгодна:

1) скласці новую праграму па курсу «Бібліятэчныя каталогі», палепшыць узровень падрыхтоўкі выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін; падрыхтаваць падручнікі па спецыяльных дысцыплінах, у тым ліку і па курсу «Бібліятэчныя каталогі»;

2) для правядзення практычных заняткаў па спецыяльных дысцыплінах адкрыць навуковую бібліятэку для студэнтаў і выкладчыкаў бібліятэчнага аддзялення, каб практычныя заняткі спрыялі развіццю творчых здольнасцей студэнтаў, што будзе садзейнічаць палепшэнню арганізацыі вучэбнага працэсу і паглыбленню ведаў студэнтаў.

Абагульненне вопыту работы па правядзенню практычных заняткаў па курсу «Бібліятэчныя каталогі» дае падставу меркаваць, што развіццю творчых здольнасцей студэнтаў будзе садзейнічаць наступнае:

1) правядзенне практычных заняткаў у бібліятэках або спецыяльна абсталяваных лабараторыях;

2) правядзенне практычных заняткаў раней, чым студэнты атрымаюць тэарэтычныя звесткі па гэтаму курсу;

3) правядзенне семінарскіх заняткаў у выглядзе дыскусій у якасці выніковых. Гэта дасць магчымасць выявіць, як студэнты засвоілі курс. Выступленні студэнтаў, іх прапановы па ўдасканаленню каталагізацыі ў бібліятэках сведчаць аб тым, што яны праявілі творчы падыход да сваёй будучай дзейнасці, да прафесіі;

4) улік выкладчыкамі вынікаў семінарскіх заняткаў на экзаменах, што з'явіцца добрым стымулам пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў і будзе садзейнічаць павышэнню паспяховасці студэнтаў;

5) забеспячэнне кожнага выпускніка бібліятэчнага аддзялення работай (гэта з'явіцца адным з галоўных стымулаў для набыцця спецыяльных ведаў і развіцця творчых здольнасцей).

**Бігеза В.М.,**
дацэнт

## ФАРМІРАВАННЕ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ БІБЛІЯТЭЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ

Праблема вывучэння чалавечых здольнасцей ужо даўно набыла выключную актуальнасць і значнасць. Пры яе вывучэнні вызначаны шэраг напрамкаў, у якіх здольнасці разглядаюцца з розных пунктаў гледжання. У дадзеным выпадку мы разглядаем фарміраванне здольнасцей у канкрэтных відах дзейнасці студэнтаў.

На наш погляд, фарміраванне здольнасцей студэнтаў мае прамую залежнасць ад іх прафесійнай накіраванасці, адпаведнасці іх інтарэсаў выбранаму профілю навучання. Пры здзяйсненні прафесійнага выбару найбольш дзейснымі матывамі, якія нясуць рэгулятыўную функцыю, выступаюць інтарэс да прафесіі і здольнасці да яе, а таксама яе каштоўнасці. Цікавасць да прафесіі становіцца асновай фарміравання прафесійнага інтарэсу, які выяўляецца ў патрэбнасці набываць прафесійныя веды, уменні і навыкі ў працэсе авалодвання прафесіяй. Асабліва важным падаецца менавіта такі падыход у дачыненні да прафесіі бібліятэкара, які будзе працаваць з дзецьмі. З'яўляючыся не толькі бібліятэкарам, але і педагогам, ён павінен валодаць тэорыяй і практыкай выхавання, навучання і адукацыі падрастаючага пакалення, разбірацца ў сацыяльна-псіхалагічных асаблівасцях асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менавіта таму ў студэнтаў спецыялізацый «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія дзіцячай літаратуры» і «Бібліятэкар, настаўнік беларускай мовы і літаратуры» неабходна выхоўваць і развіваць педагагічныя здольнасці. Да іх ліку ў першую чаргу адносяцца здольнасць перадаваць дзецям веды у кароткай і цікавай форме; здольнасць разумець дзяцей, якая базіруецца на назіральнасці; самастойны і творчы склад мыслення; знаходлівасць, арганізатарскія здольнасці (Н.Д.Левітаў); камунікатыўная здольнасці (Н.В.Кузьміна).

Не адмаўляючы важкасць усіх састаўляючых педагагічных здольнасцей, мы лічым, што асаблівую значнасць пры сучаснай прафесійнай падрыхтоўцы бібліятэкара набывае праблема фарміравання камунікатыўных здольнасцей. Безумоўна, ад таго, якое ўражанне складаецца ў чытача ад камунікатыўнай культуры бібліятэкара, у многім залежыць эфектыўнасць далейшай работы.

Выяўленне і ўдакладненне чытацкіх запатрабаванняў адбываюцца ў час індывідуальных зносін (або камунікатыўнай сітуацыі) бібліятэкара з чытачом. Гэтыя зносіны могуць быць непасрэднымі і апасродкаванымі. У непасрэдных зносінах з чытачом сапраўды таленавіты, творчы бібліятэкар-педагог выкарыстоўвае імправізацыю, шчырасць, характар жывой гутаркі.

Камунікатыўная культура бібліятэкара, на наш погляд, абавязкова павінна грунтавацца на веданні эмацыянальнай сферы чалавека. У дачыненні да дзіцячага чытача бібліятэкар павінен адчуць свет яго перажыванняў, умець чуць і слухаць дзіця, падтрымаць шматгранныя, эмацыянальныя зносіны з ім. Безумоўна, гэта ў сваю чаргу будзе садзейнічаць выхаванню пачуццяў дзяцей, бо менавіта «ў дзяцінстве чалавек павінен прайсці эмацыянальную школу - школу выхавання добрых пачуццяў» (В.А.Сухамлінскі). У гэтых умовах асобае значэнне набывае прынцып супрацоўніцтва, сатворчасці, душэўнага кантакту, які нельга звесці толькі да якой-небудзь сумы ведаў або тэхналагічных працэсаў.

Разам з тым дзеля фарміравання гэтых здольнасцей студэнтам неабходна атрымаць адпаведныя навукова-тэарэтычныя веды і практычныя навыкі ў працэсе навучання. Гэтаму ў значнай ступені будзе садзейнічаць напісанне дыпломных, курсавых работ, у якіх будуць разглядацца псіхолага-педагагічныя аспекты развіцця дзіцяці ў пэўным ўзросце, псіхалагічныя асаблівасці ўспрымання розных відаў і жанраў літаратуры, інфармацыйнага тэксту і г.д. Вывучэнне камунікатыўных аспектаў бібліяграфічнай дзейнасці можа адбывацца таксама на лекцыях, калёквіумах, семінарскіх, лабараторных занятках творчага характару (складанне бібліяграфічных дапаможнікаў, анатаванне дзіцячай мастацкай і навукова-пазнавальнай літаратуры, правядзенне дзелавых гульняў), на якіх аптымальна спалучаюцца тэарэтычныя і практычныя ўстаноўкі вучэбнага працэсу, ствараюцца ўмовы для актыўнага мыслення, замацавання ведаў, праяўлення творчых здольнасцей студэнтаў.

Фарміраванню камунікатыўных здольнасцей студэнтаў вышэйназваных спецыялізацый будзе садзейнічаць, на нашу думку, выкладанне спецкурса «Камунікатыўная культура бібліятэкараў дзіцячых бібліятэк». Вызначыць жа патэнцыяльныя магчымасці фарміравання гэтых здольнасцей у абітурыентаў дапаможа своеасаблівы тэст, які дазволіць выявіць схільнасці будучага бібліятэкара да працы з дзецьмі.

**Суддзя Э.С.,**
дацэнт

## РАЗВІЦЦЁ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНЫХ ПАТРЭБ У ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Аптымальнае працаканне працэсу развіцця пазнавальных патрэбнасцей студэнтаў дасягаецца тады, калі галоўным у пазнавальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ